# ПЛАНКА ПРЫГОЖАГА ПІСЬМЕНСТВА

## «Звязда» ўшанавала пераможцаў конкурсу апавяданняў

**У апошнія дні чэрвеня ў рэдакцыю «Звязды» завіталі пераможцы літаратурнага конкурсу, які ўжо шмат гадоў запар праводзіць газета, — каб яшчэ раз пачуць нашу падзяку за цікавыя і змястоўныя творы, абмяняцца ўражаннямі са старшынёй журы — вядомым пісьменнікам, дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесем БАДАКОМ, і, нарэшце, прайсці прыемную працэдуру ўзнагароджвання, атрымаўшы дыпломы лаўрэатаў і фірменныя звяздоўскія сувеніры. Праўда, у гарачы перыяд летніх водпускаў атрымалася сабраць толькі частку прызёраў — аднак астатнія некалькі дыпломаў і падарункаў таксама неўзабаве знойдуць сваіх гаспадароў.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Нагадаем, па выніках 2017 года пераможцай конкурсу журы выбрала **Кацярыну Захарэвіч** з апавяданнем «Морзэ на барвовай труне». «Канешне, прыемна і радасна, калі камусьці яшчэ падабаецца тое, што мы робім, — адзначыла маладая пісьменніца, — гэта матывуе і натхняе ўдасканальвацца, працаваць далей». Дарэчы, конкурсны твор аўтарка напісала ў адказ на выклік — трэба было пачаць аповед з пераліку пэўных рэчаў. «Рыдлёўка, ліхтарык, труна, манетка, жменька хлебных крошак» — з гэтага вырасла «гісторыя пра асацыяльнага хлопца, які, тым не менш, мае багаты ўнутраны свет і пачуцці, на якія таксама трэба звяртаць увагу».

Другое месца заняла **Марыя Шэбанец (Бельская)** з апавяданнем «Краем вока». Гэты поспех, на думку прафесійных літаратараў, можа стаць добрым крокам да рэалізацыі даўняй мары паэткі і пісьменніцы — напісання вялікага рамана. А навукова-фантастычнае «Спадарожнік» з дэтэктыўна-гістарычнымі дэталямі прынесла брастаўчаніну **Сяргею Белаяру** трэцяе месца.

Акрамя таго, журы вырашыла прысудзіць і дадатковы заахвочвальны прыз — **Святлане Локтыш** за апавяданне «Цыркачы», у якім на некалькіх старонках змясціліся лірыка і проза, крымінал і драма, а таксама эфектны фінал. Між іншым, Святлана — наша калега, доўгі час яна працавала журналістам у Ганцавічах і працягвае прафесійную дзейнасць у Мінску, а да напісання конкурснага твора яе падштурхнула таксама журналісцкая цікавасць: «зачапілася вокам» за маленькую заметку з залы суда, дзе маладога хлопца асудзілі за забойства жонкі. «Спачатку я мела іншую задумку, але героі пачалі дыктаваць свае ўмовы, і ў мяне муж аказаўся добры, харошы чалавек», — прызналася аўтарка.

— Што датычыцца конкурсу, я лічу, што гэта наогул вялікая ўдача, і не толькі для аўтараў-пачаткоўцаў, — надрукавацца ў «Звяздзе», грамадска-палітычным выданні, якое, па-першае, мае шырэйшае кола чытачоў, чым выданні літаратурныя, а па-другое, гэта менавіта тыя чытачы, для якіх кожны пісьменнік і працуе, — дадаў Алесь Бадак. — Бо мы пішам не толькі і не столькі дзеля таго, каб пачуць крытыку літаратуразнаўцаў, каб даведацца пра свае перавагі і хібы, а перад усім каб атрымаць водгук чытачоў. Невыпадкова конкурс існуе ўжо шмат гадоў. У свой час у ім удзельнічалі Іван Шамякін, Андрэй Федарэнка і многія іншыя вядомыя пісьменнікі, потым далучыліся не толькі прафесійныя аўтары, конкурс стаў насамрэч народным, і ў гэтым ёсць свая логіка — шукаць новыя таленты ва ўсіх кутках краіны, даць магчымасць чытачу адкрыць для сябе новыя імёны. Асобна адзначу, што ў апошнія гады дасланыя на конкурс творы дэманструюць шматжанравасць беларускай літаратуры: на старонках «Звязды» друкаваліся як класічныя апавяданні, так і гістарычныя, містычныя, дэтэктывы, фантастыка... І гэта, я лічу, стымулюе развіццё сучаснай літаратуры: чым больш разнастайная яна будзе, тым больш да яе будзе гарнуцца чытач.

Таму, шаноўныя чытачы і аўтары, мы не развітваемся, а распачынаем новы этап. Конкурс завершаны. Конкурс працягваецца!

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

### Увага! Літаратурны конкурс працягваецца

«Той, хто можа напісаць добрае апавяданне, можа напісаць і добры раман, — сцвярджае пісьменнік Алесь Бадак, які разам з нашай рэдакцыяй працягне курыраваць конкурс у 2018 годзе. — А вось той, у каго палёт і маштаб думкі дазваляюць напісаць добры раман, не заўжды здатны напісаць добрае апавяданне».

Вы належыце — альбо толькі збіраецеся ўвайсці — да ліку першых? Тады далучайцеся, калі ласка, да літаратурнага конкурсу «Звязды». Нагадаем яго галоўныя ўмовы:

— прымаюцца апавяданні на беларускай мове, якія раней нідзе не друкаваліся;

— разглядаецца толькі адно апавяданне ад аднаго аўтара;

**— памер дасланага твора не павінен перавышаць 5 старонак (10—12 тысяч знакаў)!**

Рэдакцыя пакідае за сабой права не рэцэнзаваць і не вяртаць творы.

Апавяданні, а таксама некалькі слоў пра сябе і асабістыя звесткі (сапраўдныя прозвішча і імя, дакладны паштовы адрас, кантактны тэлефон і поўныя пашпартныя даныя — нумар, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар) накіроўвайце на адрас: **г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, газета «Звязда»** з пазнакай «На літаратурны конкурс». Тэксты таксама прымаюцца ў электронным выглядзе на info@zviazda.by таксама з пазнакай «На літаратурны конкурс».

Кінакрокі

# Недалёкія 1940-я

## Серыя дакументальных фільмаў працягвае расказваць пра Мінскае гета

**29 чэрвеня афіцыйная дэлегацыя з удзелам прэзідэнтаў Беларусі, Германіі і Аўстрыі прыняла ўдзел у мітынгу-рэквіеме памяці ахвяр нацызму на тэрыторыі былога лагера смерці Малы Трасцянец. У гэты ж дзень у мінскім Доме Масквы адбылася прэм'ера дакументальнага фільма «Зондэргета» — чацвёртай у «хроніцы Мінскага гета» карціне «Майстэрні Уладзіміра Бокуна». Рэжысёр Людміла Клінцова працягнула дакументальны аповед пра тое, як з Еўропы ў Мінск для знішчэння прывозілі эшалоны яўрэяў.**

Нягледзячы на тое, што ў канцлагеры накіроўваліся не толькі дарослыя, але і дзеці, сёння можна знайсці тых, хто пазбег лёсу быць адпраўленым у Мінск разам са сваёй сям'ёй. Тады яшчэ дзеці, а сёння ўжо людзі ў гадах, каму цяжка ўспамінаць мінулае, могуць дапоўніць аповед пра «гамбургскіх» яўрэяў рэдкімі «жывымі» ўспамінамі. (Першы цягнік, усе пасажыры якога былі яўрэямі, прыбыў у Мінск у 1941 годзе з Гамбурга, і хоць пасля эшалоны прыходзілі і з іншых еўрапейскіх гарадоў, яўрэяў адтуль усё роўна называлі «гамбургскімі».)

Аўтары карціны «Зондэргета» звярнуліся да гэтага рэсурсу, што мы сёння яшчэ можам застаць, і знайшлі герояў, сем'яў якіх Мінскае гета датычыцца непасрэдна. Эдна Магдэр з Канады, Курт Маркс з Вялікабрытаніі і Міхаэль Розенберг з Германіі змаглі падзяліцца ўспамінамі пра блізкіх, што ў 1940-х былі адпраўленыя ў Мінск. Дакументальны фільм перадае сведчанне сваіх герояў і працягвае аповед пра Зондэргета, у якім раскрываецца і лішні раз замацоўваюцца факты пра халакост на беларускай тэрыторыі.

У дэталях раскрываецца, напрыклад, «абыгрыванне» адпраўкі тысяч людзей — усяго ў раён Мінска было накіравана амаль 24 тысячы чалавек — на смерць: кожны з іх думаў, што едзе жыць, забіраў дакументы і сертыфікаты ў надзеі атрымаць лепшую працу, сам аплачваў білет на цягнік. Фільм «Зондэргета» амаль не выкарыстоўвае эмацыянальны рэсурс, але перадае эмоцыю праз факт: інфармацыя, якая суправаджае гісторыю Мінскага гета, сённяшняга чалавека здольна моцна ўразіць (не выціснуць слязу, але ўсё ж). Адзінае, у кадр трапляе пара сцэн, дзе ў саміх герояў фільма на вочы наварочваюцца слёзы, і гэта дэманструе, як моцна трагедыя 1940-х адгукаецца ў сённяшнім дні. Запрасілі да ўдзелу і мінчан, якія помняць і часы, і эшалоны: на экране старажылка Мінска згадвае свае ўражанні ад навапрыбылых.

**Нягледзячы на тое, што ў канцлагеры накіроўваліся не толькі дарослыя, але і дзеці, сёння можна знайсці тых, хто пазбег лёсу быць адпраўленым у Мінск разам са сваёй сям'ёй.**

Характэрна, што «Майстэрня Уладзіміра Бокуна», якая займаецца гістарычным кіно, сродкі на чацвёрты фільм «Хронікі Мінскага гета» збірала з міру па нітцы. Бюджэт атрымаўся прадказальна недастатковы, таму прозвішчы і ролі ў здымачнай групе раз-пораз пераплятаюцца. Аўтарамі сцэнарыя сталі Барыс Герстэн, Уладзімір Бокун і Людміла Клінцова. Апошняя, як ужо згадвалася, стала і рэжысёрам, Уладзімір Бокун — прадзюсарам і аператарам, Барыс Герстэн з'яўляецца ў кадры з суправаджальным тэкстам.

Цікава таксама заўважыць, што фільм сродкамі паловы неабходнага бюджэту і неабыякавасці закранае тэму, якой павінны апекавацца хутчэй вялікія інстытуцыі са структуры ўлады. Часам гэтая тэма сапраўды з'яўляецца ў парадку дня Мінкульта, але той факт, што Мінскае гета становіцца аб'ектам увагі таксама прыватнай ініцыятывы, пацвярджае адзін з тэзісаў фільма «Зондэргета»: натуральная памяць аб трагедыі жывая

Фестываль

# ШАЎКОВЫ ШЛЯХ У КІНО

## «Лістапад» стаў часткай буйнога альянсу міжнародных кінафестываляў

**Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» разам з яшчэ трыццаццю міжнароднымі кінафестывалямі падпісаў мемарандум аб супрацоўніцтве, што, па словах праграмнага дырэктара нашага форуму Ігара Сукманава, «адкрывае перад фестывалем бязмежныя магчымасці».**

Цырымонія адбылася на адкрыцці XXI Шанхайскага міжнароднага кінафестывалю, аднаго з найбуйнейшых кінафорумаў Кітая, які выступіў ініцыятарам такога кшталту аб'яднання і стаў у пэўным сэнсе пляцоўкай для кааперацыі. Слоган «Адзін пояс — адзін шлях», пад якім стварыўся новы альянс, нагадвае пра Вялікі шаўковы шлях, што ў свой час аб'ядноўваў Усход з Захадам: мемарандум, апроч «Лістапада», падпісалі прадстаўнікі кінафестываляў Канады, Егіпта, Грэцыі, Індыі, Лівана, Новай Зеландыі, Філіпінаў і больш блізкіх нам Літвы, Польшчы і Расіі.

Падпісаны дакумент заклікае да культурнага абмену сродкамі кіно, дапамагаць разуменню нацыянальных традыцый, арганізоўваць адпаведныя мерапрыемствы на кінафестывалях, што падпісалі мемарандум, запрашаць калег па альянсе да членства ў журы альбо ў якасці гасцей кінафестываляў, садзейнічаць распаўсюджванню нацыянальнага кіно.

«Мемарандум дае нам магчымасць напрамую стукацца ў дзверы, — кажа Ігар Сукманаў, які ўласнаручна падпісаў дакумент на шанхайскім кінафестывалі, — пашыраць кантакты і наладжваць больш інтэнсіўнае і «наварыстае» супрацоўніцтва. Нейкія намёткі, хоць яны і носяць рабочы характар, ужо ёсць: мы навялі масты з Новай Зеландыяй і Кітаем, ёсць перспектыва арганізаваць сумесныя спецыяльныя праграмы. Стварэнне альянсу аб'ядноўвае фестывалі, робіць іх больш згуртаванымі і дае ім неабмежаваныя магчымасці. Пашырэнне кантактаў, напрыклад, палегчыць атрыманне патрэбнага нам кіно, якое не мае еўрапейскага дыстрыб'ютара. Або дазволіць запрашаць на «Лістапад» прадстаўнікоў Балгарыі, Кітая, Польшчы ў якасці членаў журы, лектараў і прафесіяналаў для майстар-класаў. Адпаведна, мы папулярызуем ва ўсім свеце і свой фестываль».

Важна звярнуць увагу, што падпісаны дакумент карысны не толькі «Лістападу», а беларускай кінаіндустрыі ўвогуле — тэкст мемарандума заклікае ствараць працоўныя адносіны па кінапрадукцыі і дыстрыбуцыі.

Стварэнне альянсу пакажа ўсе свае магчымасці толькі з часам — такога кшталту фарміраванне наўрад ці здольна даць імгненны вынік, затое можа прапанаваць пэўную стратэгію, накіраваную на міжнароднае супрацоўніцтва. Так ці інакш, «шаўковы шлях» у кіно створаны, і ўдзел у ім «Лістапада» ў пэўным сэнсе датычыцца кожнага кінааматара, які шукае на вялікім экране нешта незвычайнае.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ**